
Горацкая газета
№23
31 траўня 2007
# УзГорак
Кошт свабодны









Справедливости ради отмечу, что в обеих направлениях обзор с объездной здесь настолько плохой, что едущая по дороге Горки-Ленино техника появляется на перекрестке словно из засады.

# Гонки со смертью

## ИЗ ДЕСЯТИ ВОДИТЕЛЕЙ, МИНОВАВШИХ ЗНАК "СТОП", НИ ОДИН НЕ ВЫПОЛНИЛ ЕГО ТРЕБОВАНИЙ

**Поведение водителей на самом опасном горецком перекрестке зачастую напоминает игру в "Русскую рулетку" И если, прокручивая барабан револьвера, лихой гусар рискует только собственной отчаянной головой, то "притопляющий" педаль газа у ярко-красного знака безответственный лихач, ставит в зависимость еще и чужие жизни.**

О том, что перекресток дорог Горки-Ленино и объездной из Орши на Мстиславль уже много лет пользуется дурной славой, в Горках известно, наверное, всем. Регулярно там гибнут люди, разбивается техника. Водители жалуются на плохие условия (отвратительная видимость, непродуманно установленные знаки), сотрудники ГАИ – на разгильдяйство водителей.

В прошлую среду мы решили провести собственный мониторинг ситуации на злополучном перекрестке. С 10.29 до 11.01. автор наблюдал там за движением транспорта. К услугам ГАИ решено было не прибегать – у нас за рулем мужики ушлые и машину с инспектором чуют за версту. За полчаса такого дежурства вывод был сделан один: правы и те и другие, только погибшим и раненым в ДТП людям от этого не легче.

Итак, на второстепенной объездной дороге перед перекрестком с обеих сторон установлены два знака "СТОП", требующих, как известно, полной остановки транспорта.

10.39. Белый молоковоз- ГАЗ-САЗ едет со стороны Мстиславля, игнорируя знак поворачивает на Ленино, чуть снизив скорость.

10.41. "Рено", в котором сидят четыре человека, едущий уже со стороны Орши, притормаживает и медленно-медленно проезжает через весь перекресток. Видно, что водитель внимательно оглядывается. Надо сказать, что за те полчаса, в которые проводилось наблюдение, это был, пожалуй, наиболее дисциплинированный участник движения.

10.42. "Москвич" и "Жигули" едут с мстиславского направления, поворачивают на Ленино, лишь чуть снизив скорость

10.46. ГАЗ-53 с фургоном, практически не тормозя, проходит поворот в том же направлении. Водителя не впечатлил даже автомобиль ГАИ, только что промчавшийся по дороге на Горки.

10.47. Еще одна пятьдесяттройка с брикетом поворачивает на Ленино, не замечая знака.

10.48. Автобус ПАЗ, судя по всему, со студентами, едет с оршанской стороны. Знак остановки проигнорирован, водитель начинает осматривать дорогу, только выехав на перекресток и поворачивая на Ленино.

10.49. Снова "пятьдесяттройка", оборудованная под перевозку скота. Поворот на Ленино машина проходит, словно болид "Формулы-1". Никакого торможения. Даже стопы не моргнули.

10.54. "Жигули" зеленого цвета едут со стороны Орши. При повороте на Горки водитель немного снижает скорость.

11.00. Всё, полчаса, отведенные себе на наблюдение истекли. Нет, стоп. С оршанского направления едет еще одна иномарка. Ну! Хоть ты остановись! Как бы не так! Немного притормозив, водитель без остановки поворачивает на Горки.

Как сообщили в ГАИ, в 2008-м году здесь намечено устройство развязки (кольца). Но ведь до тех времен надо еще дожить, и кое-кому - в самом буквальном смысле слова.

На всякий случай.

О трагедиях на злополучном перекрестке уже не раз писала местная и не только местная пресса. Большинство номеров автомобилей, проехавших за полчаса через перекресток, были могилевскими (читай – горецкими!). Наши водители что – совсем газет не читают?

*Иван МОРОЗОВ, фото автора*

ПЯТАЯ КАЛОНКА

## БЕЛАРУСКІЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ВЫСТАВЯЦЬ НА ТАРГІ

**Беларусь гатова прадаць частку акцый высокапрыбытковых прадпрыемстваў замежным інвэстарам, – заявіў 29 мая першы намесьнік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка на гадавым сходзе грамадзкай арганізацыі "Канфэдэрацыя прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў".**

Ён зазначыў, што цяпер "дзяржава сьвядома ідзе на працэс прыватызацыі – не абвальны, а цывілізаваны. Мы гатовы прадаць частку сваіх прадпрыемстваў, але на ўмовах, у якіх зацікаўлены".

Сямашка нагадаў, што ў нафтахімічнай прамысловасьці Беларусі, якая вельмі цікавіць замежных інвэстараў, неабходна кожныя два-тры гады абнаўляць вытворчасьць. Паводле яго, прадпрыемствы "Белнафтахіму" "цяпер знаходзяцца на нізкім старце і гатовыя да продажу акцый на цывілізаваных умовах".

Першы віцэ-прэм'ер таксама зазначыў, што неўзабаве Беларусь атрымае міжнародны крэдытны рэйтынг. Гэта дасьць магчымасьць Беларусі рабіць IPO (Initial Public Offering – першаснае публічнае разьмяшчэньне акцый) на міжнародных рынках.

*Радыё Свабода*



## ТРЕБУЮТСЯ НА РАБОТУ

**ДЕТСАД Д.СОВА**
Срочно – воспитатель на подмену отпусков. Проезд оплачивается.

**АЛЬФА-ЗЕТ**
Рабочие строительных специальностей, разнорабочие

**ГОРКИВОДХОЗ**
Электромеханик (4-я гр.доп.), рабочие

**АВТОБАЗА-17**
Электромонтер, электрогазосварщик, водитель кат.Д

**ГОРКИЛЕН**
Грузчики
Рабочие-строители

**РАЙПО**
Продавцы
Грузчики

**ПРЕМА**
Ученики (шлифовщики, сборщики)

**ОХРАНА**
Инженер (системы и ср-ва охраны)

**УЗЕЛ ПОЧТОВОЙ СВЯЗИ**
Почтальоны

**КОММУНАЛЬНИК**
Грузчики, дворники

**МП РОС-МОДЕРН**
Портные, закройщики

*По данным Центра занятости. Тел. 5 44 40*

*Мнение экономиста*

# Страусиный рефлекс

## И политика и экономика против нас

Слушая высказывания наших высших госслужащих, когда они читают подготовленные заранее доклады умиляешься: так у нас на бумаге все хорошо и гладко, что диву даешься. Депутаты палаты почти единогласно (только один против) принимают отмену льгот, Лукашенко заявляет, что это не поднимет социальную температуру в обществе, вице-премьер Семашко докладывает, что мы с честью выдержали повышение цен на энергоносители, а народ, судя по всему, все это то ли поддерживает, то ли просто проглатывает.

Но самое интересное начинается, когда наши большие руководители начинают говорить без бумажки. Тот же Семашко признал, что с начала года Беларусь уже задолжала России целых 400 миллионов(!!!) долларов за газ. А на вопросы корреспондентов, из каких, собственно, источников этот долг собираются гасить, ответил, что ни в коем случае не из тех 625 миллионов долларов, которые Газпром перечисляет за акции проданного Белтрансгаза. Поскольку все экономсты считают, что эти деньги могут и не попасть в Беларусь, а пойдут на взаимозачет. Но Семашко сказал "Нет", значит – нет. Но где тогда взять деньги? И здесь видна настоящая белорусская сообразительность вице-премьера: мол, возьмем у России кредит! Вот где нужно учиться будущим рокфеллерам и гейтсам! Возьмем у России газ и пусть она сама же за него заплатит! Но пока не все ладится с российской стороной (или наоборот – у них там все с головами в порядке).

На последней встрече с представителями российских регионов Лукашенко как мог пугал россиян: Не отталкивайте, дескать, от себя последнюю дружественную страну. Буду президентом я, или кто-то другой, потеряете Беларусь – никто с вами считаться не станет.

В переводе на нормальный язык это означает: оплачивайте, как и ранее, наши запросы, а мы под песни о славянском братстве будем строить свой авторитарный социализм. Но здесь новые проблемы. Немецкое правительство, которое сейчас председательствует в ЕС, на днях сообщило, что с 21 июня вступают в силу экономические санкции против Беларуси. Основанием для их введения были и есть нарушения нашими властями добровольно принятых на себя обязательств по выполнению международного трудового законодательства, а также – освобождение политзаключенных. И если вторую часть под давлением демократических стран и экономических проблем правительство начало выполнять, освободив Северинца, Статкевича, Садовскую, то что оно будет делать с первой частью – сказать тяжело. Ведь столько усилий приложили и столько лет потратили власти Беларуси для уничтожения независимых профсоюзов, а теперь, что – их возрождать? А как? Директивами, или указами? Хоть ты возьми вертикальщикам, да и перейди в эти самые профсоюзы, чтобы отчитаться и перед начальством, и перед Евросоюзом. Но если для начальства это сойдет, то Европу такими хитриками не обманешь. Да и Козулин с Дашкевичем остаются за решетками, оставляя заложниками тысячи наших людей, которые могут лишиться работы в результате санкций. Вслед за этим добавляются переговоры с Ираном, на которых нефтяная тема – для нас. А на самом деле интерес Ирана направлен на возможность доработки оружия с помощью наших специалистов. И как отреагирует цивилизованный мир на наше военное сотрудничество со страной, которую официально обвиняют в международном терроризме, можно не гадать – теми же негласными, или официальными экономическими и политическими санкциями.

А слова А.Лукашенко, что после 13 лет руководства он ничего не собирается менять ни в политике, ни в экономике, свидетельствуют о том, что за это время он мало чему научился и не замечает, что мир вокруг уже другой. И сколько бы наши власти и мы с вами, уважаемые обыватели, ни прятали головы в песок и ни делали вид, что ничего вокруг не происходит, мир вокруг отрывается от нас в развитии все дальше и дальше. И тем тяжелее нам дастся потом возвращение на путь цивилизации.

*Андрей ЮРКОВ, 623 61 08*

# 30 траўня – восьмыя ўгодкі трагедыі на Нямізе

**30 траўня 1999 году піўны фэст у цэнтры Менску завяршыўся адной з самых страшных трагедый у навейшай гісторыі Беларусі. Хаваючыся ад дажджу ў пераходзе на станцыі мэтро "Няміга", у цісканіне загінулі 53 чалавекі, яшчэ больш як 250 пацярпелі. Большыня загінулых – маладыя людзі ва ўзросьце ад 14 да 20 гадоў.**

Большыня тых, каму ўдалося цудам уратавацца з таго "пекла", дагэтуль балюча перажываюць трагедыю. У ёй страцілі сваіх сяброў ці родных – на такія мерапрыемствы, як правіла, хадзілі кампаніямі.

...Вольга, тады студэнтка БДУ, ужо была пахаваная пад целамі. І толькі тое, што яе хлопец трымаўся сам і да апошняга не адпусьціў яе руку, урэшце дазволіла вылезьці з-пад ужо абмяклых целаў. Але зноў перажыць тыя хвіліны, нават ва ўспамінах, яна ня хоча:

"Шчыра кажучы, напраўду ня хочацца. Проста яшчэ раз пра гэта расказваць – гэта чарговым разам усё перажыць. Зразумейце правільна. Вы зараз нагадалі, і я зноў там... Эмацыйна гэта вельмі складана перажываць зноў, ніякага жаданьня. Прынамсі, я гэты дзень другім днём нараджэньня не адзначаю. І стараюся ўвогуле не ўспамінаць той дзень, шчыра кажучы".

Пасьля пачатку лііўня Аляксандар з жонкай аднымі зь першых скіраваліся ў падземны пераход на "Нямізе". І гэтае "першынства", як ён кажа, уратавала:

"Мы якраз уніз спускаліся адны зь першых. І тое, што ўтварылася за намі ззаду, гэта проста было стаўпатварэньне людзей, калі яны пачалі душыць адзін аднаго. То бок, урэшце мы зболь-шага аказаліся гледачамі, а ня ўдзельнікамі гэтага страшнага відовішча. І відовішча насамрэч было вельмі страшнае і вельмі непрыемнае. Але гэта ня тое, што нехта спэцыяльна ціснуў, проста звычайны эфэкт натоўпу, калі задняя ня ведаюць, што адбываецца наперадзе. У гэтым выпадку было якраз так".

У натоўпу ня розум, а інстынкты

Псыхоляг Міхаіл Дзернакоўскі кажа, што паводзіны маладых людзей 30 траўня 1999 году цалкам укладаюцца ў тэорыю натоўпу, якія дзейнічае ня розумам, а інстынктамі:

"Можна казаць пра імпульсіўныя дзеяньні досыць вялікай групы людзей. Спужаліся дажджу, рванулі ў мэтро. Вось вам асноўная прычына. Насамрэч – вельмі просты імпульс. У дадзеным выпадку ніякіх правакацый, па ідэі, быць не магло. Гэты інстынкт досыць распаўсюджаны, то бок, людзі пачынаюць калектыўна штосьці рабіць, не абдумваючы магчымыя вынікі. Жаданьне знаходзіцца на "пэрыфэрыі" натоўпу (у тых жа дзяўчат), нявведаньне таго, што своечасова трэба перавярнуцца на жывот, калі вакол людзі душаць. Фактычна гэта абумовіла дастаткова вялікую колькасьць сьмяротных выпадкаў. Здарылася цісканіна, адзін пасьлізнуўся, другі, кагосьці прыціснулі да лесьвіцы; людзей нашмат больш, чым пераход можа зьмясьціць. З-за гэтага ўсё і адбылося, калі разабрацца".

Дзяржава "прыкрыла" вінаватых

У Натальлі Навакоўскай восем гадоў таму на Нямізе загінула 16-гадовая дачка Аляўціна. Неўзабаве спадарыня Натальля ўзначаліла грамадзкае аб'яднаньне "Цэнтар сацыяльнай дапамогі "Няміга-99", юрыдычны адрас якога потым перайшоў да Камітэту дзяржкантролю, і цяпер арганізацыя дзейнічае паўпадпольна. Зрэшты, як кажа жанчына, дзяржава ў сытуацыі зь Нямігай зрабіла ўсё, каб "прыкрыць" вінаватых:

"Я лічу, што ва ўсім вінавата дзяржава. І ня проста дзяржава агулам, а вінаватыя людзі, якія адказваюць за бясьпеку ў дзяржаве. Бо каб стварыць такую сытуацыю, калі склікалі людзей на масавае мерапрыемства і не забясьпечылі іх бясьпеку, то нельга казаць, што вінаваты ва ўсім былі толькі гэтыя дзеці. А менавіта вінаватыя былі тыя, хто за іх адказвае. Мы гэтых людзей утрымліваем, разумееце? Мы ўсё жыцьцё працуем, адлічваем падаткі, на якія жывуць гэтыя людзі. І яны павінны несьці адказнасьць. А яны не нясуць ніякай адказнасьці".

Па гарачых сьлядох Генэральная пракуратура распачала крымінальную справу супраць міліцыянтаў, якія адказвалі 30 траўня 1999 года за парадак на менскім сьвяце піва. Начальніка міліцыі грамадзкай бясьпекі Упраўленьня ўнутраных справаў Менгарвыканкаму Віктара Русака і былога начальніка аддзелу масавых мерапрыемстваў Міхаіла Кандрацінa абвінавацілі "ў халатным стаўленьні да службовых паўнамоцтваў". Аднак справа, якая цягнулася тры гады і разраслася да 30 тамоў, была спыненая 25 сакавіка 2002 году ў зьвязку "са сканчэньнем тэрміну даўнасьці". Вінаватых у трагедыі не аказалася.

Першы час адказнасьць за трагедыю ўлады часткова ўсё ж прынялі і на свой адрас. На распараджэньне Менгарвыканкаму і мясцовых выканкамаў цягам двух гадоў сваякам загінулых далі права бясплатнага праезду ў грамадзкім транспарце, набыцьця бясплатных мэдыкамэнтаў і вызваленьня ад аплаты камунальных паслугаў. Аднак у 2002-м прэзыдэнцкай пастановай льготы былі скасаваныя – відавочна, на падставе ўсё таго ж "тэрміну даўнасьці".

*Ігар Карней, Радыё Свабода*

## ЦЕНЫ НА РЫНКЕ

### РЫНОК Г.ГОРКИ (СРЕДА, 30.05)

| Продукты | от | до |
|---|---|---|
| Укроп, пучок | 300 | |
| Лук, пучок | 500 | 1000 |
| Свекла свеж. крас, пучок | 500 | |
| Редиска, пучок | 500 | 800 |
| Огурцы свежие, кг | 4000 | |
| Яйцо, дес | 2200 | 2500 |
| Картофель, ведро 10л. | 4000 | |
| Рассада: | | |
| Капуста позд, за 50 | 3000 | |
| Капуста позд, за 100 | 7000- | 8000 |
| Помидоры, дес. | 3000 | |
| Огурцы, за 1 | 1000 | |
| Перец, дес | 2500 | 3500 |

### МИНИ-РЫНОК БГСХА (СРЕДА, 30.05)

| Продукты | от | до |
|---|---|---|
| Редиска, пучок | 800 | 1000 |
| Лук, пучок | 500 | 1000 |
| Петрушка, пучок | 500 | |
| Чеснок, гол. | 300 | 500 |
| Укроп, пучок | 300 | |
| Картофель, ведро 5л. | 3000 | |

## Курсы валют на 31 траўня

| | Аграпрамбанк | Беларусбанк | Белінвестбанк | Нацбанк | за тыдзень |
|---|---|---|---|---|---|
| Даляр ЗША | 2140-2160 | 2135-2160 | 2135-2160 | 2145 | 0 |
| Еўра | 2870-2970 | 2840-2940 | 2860-2920 | 2883,42 | +4,51 |
| Расейскі рубель | 78-83,6 | 80-83,5 | 78-84 | 82,81 | -0,02 |
| Грыўна | 380-480 | 360-440 | 350-450 | 426,06 | -1,15 |
| Ангельскі фунт | | 3850-4250 | | 4243, 99 | +9,33 |
| Злоты | 660-780 | 660-760 | | 753,07 | -5,31 |






Хорошо поесть – первое дело для туриста

Ах, лето!

# Турслет перед турслетом

Районный туристический слет, проходивший на прошлой неделе в Полящицкой роще, завершился успехом сельских команд. Во второй день соревнований только один представитель города, СШ №2, смог одержать победу в конкурсе туристского быта. Второе и третье места здесь заняли команды Маслаковской и Шишевской школ.

В конкурсе песни жюри дало сразу два первых места – участникам из Паршино и Овсянки. Второе и третье – у команд Маслаковской и Котелевской СШ.

На полосе препятствий в этот день лучшими были ребята младшей группы из Паршино. Призерами стали также команды из Маслаков и Овсянки.

В ориентировании на местности тройка лидеров мало чем отличается от предыдущих: Паршино, Овсянка, Котелево.

И наконец – общий зачет. В старшей группе победила команда из Шишево. Второе место – у Котелевской СШ, третье – у Овсянковской.

Среди младших участников первое место у Паршинской СШ, второе и третье – у Овсянки и Шишево.

Теперь сборной команде, составленной из лучших туристов района предстоит участие в областных соревнованиях в Ямнице, что под Могилевом.

А уже в эти выходные в Полящицкую рощу приедут команды взрослых туристов.

*Иван МОРОЗОВ*


На переправе – команда Гимназии


Руководитель туристического клуба из Овсянки Александр Петрусенко готовит не только туристов, но и судей по этому виду спорта. В этот раз в судейской коллегии успешно работали его воспитанницы Рита Пытькова и Аня Павлова

# Было бы желание ДОБРАТЬСЯ ТУДА, КУДА НУЖНО, ДЛЯ ТУРИСТА - НЕ ПРОБЛЕМА

Всегда интересно участвовать в представительных соревнованиях, особенно если они проводятся на общегосударственном уровне. Вот и команде БГСХА выпала возможность принять участие в республиканском турслёте. И хотя в последний момент перед туристами встала проблема—отсутствия транспорта для поездки (в это же время на различные соревнования разъезжались и многие другие команды, а автобусов в академии мало), желание соревноваться было настолько велико, что команда нашла всё-таки решение этого вопроса и попала на турслёт.

С 17 по 20 мая 2007 года на берегу реки Вилия в живописном уголке Молодеченского района проводился IX республиканский туристический слет студентов ВУЗов. Всего в нем приняли участие 20 команд из всех областей Беларуси.

БГСХА представляла команда «Академия», которая накануне великолепно выступила в конце апреля на академических соревнованиях среди факультетов по туристско-прикладному многоборью.

Республиканский слет включал пять конкурсов: представление команды в жанре КВН, конкурс фотографий, газет «Будни слета», туристской песни, «туристские навыки и быт». Слет студентов проводился с целью объединить усилия молодежи по пропаганде здорового образа жизни, спорта и туризма, привлечь людей к активному отдыху. Торжественное открытие вечером 17 мая стало настоящим шоу с парадом участников и подъемом флага под гимн Республики Беларусь в память о героях Великой Отечественной войны.

Через несколько часов соревнования открылись ночным ориентированием, в котором команда разделялась на три связки и каждая из них проходила свой маршрут. 18 мая в 10ч. утра был дан старт короткой дистанции по технике пешего туризма. Первой стартовала команда БрГУ, которая и показала лучшее время. Соревнования прошли в интересной напряженной борьбе.

Вечером того же дня проводился конкурс представления команды в котором сборная «Академия» заняла 7 место. Не менее насыщенным был третий день слета - 19 мая. Студенты соревновались на длинной дистанции (контрольный туристский маршрут). Он содержал 11 этапов: гать, вязка узлов, переправа по бревну с укладкой, вязка носилок и переноска «пострадавшего» по пересеченной местности, прохождение обозначенного маршрута («линия»), определение расстояния до ориентира, азимута на предмет, ориентирование в заданном направлении и другие. Протяженность трассы более 8 км. Остроту и зрелищность состязаниям придавала прохождение навесной переправы длиной 20 метров на высоте 11 м, спуск дюльфером с высоты 10 м. На этой трассе туристы сборной БГСХА, в составе которой выступали Е.Васильева.(агрофак), Н.Голуб. и М.Бриштен (бухфак), М.Авдеев М.(агроэк), А.Букетов А.(зоофак), Т.Кожегулов Т.(МСФ), заняли по времени прохождения полосы препятствий пятое место, а с учетом штрафного времени – седьмое. Этот результат позволил участникам команды выполнить первый разряд.

В этот же день проходили и конкурсы газет «Будни слета» и туристской песни.

Время быстро пролетело. Четвертый день слета был отдан подведению итогов. Лагерь сворачивался, и все студенты, отдохнувшие и довольные, возвращались домой. Было немного грустно покидать прекрасное уютное место возле рек Вилия и Уша, расставаться с ребятами из других ВУЗов республики, с которыми познакомились на волейбольной, футбольной площадках и дискотеке.

В общекомандном зачете уверенную победу одержали туристы БГУФК, вторыми стали ребята из БрГУ, третьими - БНТУ.

А напоследок хочется пожелать участникам туристических походов во время летнихстуденческих каникул интересных маршрутов и легких рюкзаков.

*И.КРУГЛИК, Д.КОРОБЕЙКО*

ПЯТАЯ КАЛОНКА

## ПЕРВОГО ИЮНЯ – МЕЖДУНАРОДНЫЙ ДЕНЬ ЗАЩИТЫ ДЕТЕЙ

**Как всегда наша газета стремится создать в праздничный день веселое настроение, а посему в этот раз у нас —**

## АНЕКДОТЫ ПРО ВОВОЧКУ

- Почему ты плачешь, Вовочка?
- Мама сказала папе, что он слон. Папа ответил маме, что она курица.
- Ну и что?
- А кто же тогда я?!

Мама ругает маленького Вову:
- Посмотри на свои грязные руки! Мерзость! Быстро оближи!... Быстро!

Вечер. Маленький Вовочка стоит во дворе и орет изо всех сил:
- Наташка!
Из окна высовывается заспаный папаНаташки:
- Она уже спать легла! Может, я чем помогу?
- Нет, она мне нужна как женщина!
Через пять минут во двор вылетает Наташка - в мини-юбке и полупрозрачной блузке.
- Знаешь, Наташа. - Говорит ей Вовочка, - мой мячик в женский туалет закатился...

Мама:
- Ну, Вовочка, как ты с папой тут себя вел, пока меня не было?
Вовочка:
- Очень хорошо, мама. За это каждое утро папа брал меня с собой на озеро, мы заплывали на лодке на самую середину и потом я вплавь добирался до берега.
Мама:
- О Боже! Это же большое озеро!?
Вовочка:
- Да не переживай, мама. Я доплывал хорошо. Трудно было только каждый раз из мешка выбираться...

Маленький Вовочка спрашивает:
- Тетя, а почему у вас с дядей ещё нет детей?
- Знаешь, Вова, нам аист никого ещё не принес.
- А-а, - говорит Вовочка. - Ну если вы ещё в аиста верите, то понятно.

Дети с училкой снялись на фотку. Учительница убеждает их купить каждому себе по фотографии:
- Представьте, как это здорово - когда вы уже будете взрослыми, посмотрите на фото и скажете: "А вот Машенька, она теперь актриса. А это вот Петечка, он теперь врач..."
Тут раздался тихий голос Вовочки с задней парты:
- "А вот это Марь Ивановна, она давно уже померла..."

Урок химии. Лабораторная.
Учительница:
- Маша, у тебя какого цвета жидкость получилась?
Маша:
- Розового.
- Садись, пять. А у тебя, Петя?
- Желтоватого.
- Не совсем правильно. Четыре. Садись. Вовочка, а у тебя?
- А у меня - коричневого!
- Двойка! ЛОЖИСЬ!!!

# Кангрэс прайшоў у бурных спрэчках

**Дэлегаты Кангрэсу дэмакратычных сілаў ухвалілі эканамічную плятформу, малую канстытуцыю і стратэгію дзеяньня аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Сустаршынямі Палітычнай рады сталі старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка, старшыня Камуністычнай партыі беларускай Сяргей Калякін, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька выканальнік абавязкаў старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі "Грамада" Анатоль Ляўковіч.**

Дцзень пачаўся з падвядзеньня вынікаў фармаваньня фракцыяў кангрэсу. Іх створана 8 і самая вялікая – 201 дэлегат– фракцыя паплечнікаў Аляксандра Мілінкевіча "Рэгіёны за свабоду".

Усяго 6 фракцыяў набралі неабходную колькасьць сяброў, каб мець права вылучыць сваіх прадстаўнікоў у прэзыдыюм Палітычнай рады аб'яднаных дэмсілаў. Гэта фракцыі "Рэгіёны за свабоду", "Грамадзянскае дзеяньне"(АГП), партыі БНФ, ПКБ, "Справядлівая і салідарная Беларусь" (паплечнікі Аляксандра Казуліна) і фракцыя "Саюз працы"Аляксандра Бухвостава.

Лідэры фракцыяў прэзэнтавалі свае пазыцыі, а потым пачалося абмеркаваньне дакумэнтаў вынесеных на кангрэс – стратэгіі, эканамічнай плятформы і Малой канстытуцыі.

Спрэчкі вяліся вакол стратэгіі. Нагадаю, супольную стратэгію выпрацавала Палітрада. Але Мікола Статкевіч прапанаваў альтэрнатыўны варыянт – стратэгію "Эўрапейскай кааліцыі". Яе падтрымаў рух "За Свабоду". Паводле аўтараў – гэта стратэгія дзеяньня і эўрапейскага выбару.

Аляксандар Мілінкевіч у сваім выступе заявіў, што ў стратэгіі Палітрады дадзена няправільная ацэнка сытуацыі. А калі ёсьць разыходжаньні ў дыягназе, то ёсьць разыходжаньні і ў дзеяньнях.

Спадар Мілінкевіч назваў свае асноўныя каштоўнасьці – дэмакратыя, незалежнасьць й інтэграцыя ў Эўропу.

Большынёй галасоў дэлегаты падтрымалі эканамічную плятформу і Малую канстытуцыю, а таксама ўхвалілі шэраг рэзалюцый і зваротаў кангрэсу.

Але найбольшую інтрыгу мела галасаваньне па стратэгіі. Дэлегаты нават правялі адмысловую перарэгістрацыю. У выніку 611 дэлегатаў зарэгістравалася.

Рэдакцыйная камісія прапанавала прыняць за аснову стратэгію Палітрады. Праект альтэрнатыўнай стратэгіі ня быў уключаны для галасаваньня, бо, маўляў, ён не паступіў і не было магчымасьці яго разгледзець.

Павал Севярынец і Мікола Статкевіч заклікалі галасаваць супраць стратэгіі Палітрады. Станіслаў Шушкевіч заклікаў наводзіць масты паміж стратэгіямі.

Пасьля першага галасаваньня высьвялілася, што многія дэпутаты галасавалі "за" і "супраць". Пры паўторным галасаваньні 365 выказаліся "за", 185 "супраць", 20 – устрымаліся. Такім чынам, стратэгія Палітрады была прынята за аснову.

Потым адбылося галасаваньне складу новай Палітрады – калектыўнага кіроўнага органа аб'яднаных дэмсілаў. Тут асноўныя спрэчкі выклікала прадстаўніцтва прадпрымальнікаў, якія ў Палітрадзе прадстаўлены дзьвюма структурамі.

Таму старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка прапанаваў уключыць у склад Палітрады прадстаўнікоў другой прадпрымальніцкай структуры. Урэшце, вырашылі, што гэтае пытаньне вырашыць сама Палітрада.

Кангрэс ухваліў склад Палітрады з 45 чалавек. У яе ўвайшлі сябры Партыі БНФ, сацыял-дэмакратаў, АГП, ПКБ, жаночай партыі "Надзея", "Маладога фронту", аргкамітэту Беларускай партыі працы, руху "За свабоду", партыі "Зялёныя", аргкамітэту Партыі свабоды і прагрэсу.

Мікола Статкевіч адмовіўся ад сяброўства ў новай Палітрадзе, хаця яговыя паплечнікі там ёсьць. Статкевіч заявіў "Свабодзе", што кангрэс ня здолеў прыняць эфэктыўную, пераможную стратэгію, стратэгію дзеяньня. Ён заявіў, што асноўная ўвага была сканцэнтравана на тым, каб з'есьці Мілінкевіча.

Аляксандар Мілінкевіч, падводзячы вынікі кангрэсу заявіў, што застаецца ў кангрэсе і падпарадкоўваецца яго рашэньню. Ён адмовіўся ад сустаршынёўства і сяброўства ў Палітрадзе. Ён мяркуе, што цяпер нельга казаць пра аб'яднаныя дэмсілы і цяпер будуць рэалізоўвацца дзьве стратэгіі. А. Мілінкевіч заявіў, што цяпер зоймецца стварэньнем руху "За свабоду".

На кангрэсе не абышлося без скандалаў. Сябра незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" Зьміцер Хведарук заявіў, што арганізатары перашкаджалі ўдзелу ў кангрэсе сяброў "Маладога фронту". Да прыкладу, у прадстаўніцы Артура Фінькевіча, якія цяпер адбывае "хімію", спачатку адабралі, а потым са скандалам вярнулі дэлегацкі мандат.

Журналісцкай акрэдытацыі была пазбаўлена сябра "Маладога фронту"Алена Макарэвіч. Паводле кіраўніка прэсавай службы кангрэсу Сяргея Вазьняка, Макарэвіч нібыта актыўна ўдзельнічала ў групе падтрымкі Аляксандра Мілінкевіча, скандавала і махала рукамі.

Павал Севярынец заклікаў дэлегатаў кангрэсу праявіць салідарнасьць і заўтра прыйсьці да суду ў Менску, дзе будуць судзіць сяброў "Маладога фронту".

**Вынікі Кангрэсу аб'яднаных дэмакратычных сілаў абмяркоўваюць у "Праскім акцэнце" галоўны рэдактар газэты "Народная воля" Сьвятлана Калінкіна, палітоляг Віталь Сіліцкі і аглядальнік нашага радыё Віталь Цыганкоў.**

Ці вырашыў Кангрэс супярэчнасьці?

Дракахруст: "Супярэчнасьці ў шэрагах апазыцыі, якія тычыліся ў першую чаргу праблемы лідэрства, узьніклі літаральна адразу пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2006 году. Зь цягам часу яны толькі абвастраліся, – уласна, Кангрэс і склікаўся для іх вырашэньня. Ці вырашыў ён іх, ці дакладней, як ён вырашыў іх? Наколькі заканамерным быў такі вынік, у тым ліку і ў сьвятле досьведу іншых краінаў?"

Цыганкоў: "Тут – як паглядзець. Калі задача была фармальна пазбавіць Аляксандра Мілінкевіча ягонага статусу як адзінага лідэра апазыцыі, то здаецца, што гэтая задача лідэрамі некаторых партыяў выкананая. Калі была задача прадэманстраваць кардынальныя разыходжаньні, то яе таксама выканалі. Калі задача была паказаць, што ў апазыцыі сёньняшняй ёсьць адна частка палітыкаў, больш статусная і больш салідная, і другая – больш маргінальная, маладзевая і мітынговая, то на Кангрэсе гэты падзел таксама выразна быў праяўлены.

В.Цыганкоў: "Калі задача была пазбавіць Мілінкевіча статусу адзінага лідэра апазыцыі, то гэтая задача лідэрамі некаторых партыяў выкананая".

Мне здаецца, парадокс сытуацыі ў тым, што якраз Кангрэсу патрабавалі тыя, хто больш усіх заклікаў да еднасьці, але яны безумоўна разумелі, што насамрэч еднасьці няма, і што Кангрэс прывядзе дэ факта да расколу. Тады паўстае пытаньне – ці былі яны шчырымі, калі заклікалі да еднасьці на Кангрэсе?

Але, падсумоўваючы мае гэтыя ня самыя аптымістычныя словы, я б сказаў, што тут ня варта моцна драматызаваць сытуацыю. Варта называць рэчы сваімі імёнамі: палітычныя сілы аб'ядноўваюцца, калі ёсьць нейкая вялікая падзея, вялікая нагода. Былі прэзыдэнцкія выбары – беларуская дэмакратычнай апазыцыі спатрэбіўся адзіны кандыдат. Як паказвае міжнародны досьвед, пасьля выбараў, – альбо пасьля паразы, альбо пасьля перамогі, ня важна, – кааліцыі заўсёды распадаюцца. Прыблізна тое ж самае цяпер адбылося зь беларускай апазыцыяй, толькі гэта расьцягнулася на год. Напярэдадне пакуль прэзыдэнцкіх выбараў ня бачыцца, хутка будуць парлямэнцкія выбары, а для іх адзіны лідэр не патрэбны".

Дракахруст: "Спадарыня Калінкіна, Віталь Цыганкоў ахарактарызаваў вынікі Кангрэсу з доляй іроніі – у вас таксама настолькі ж іранічнае стаўленьне?"

Калінкіна: "Не. У мяне такое ня вельмі прыемнае ўражаньне пасьля кангрэсу, але што тычыцца лідэрства – я таксама лічу, што ніякай драмы не адбылося. Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы без Аляксандра Казуліна на прэзыдэнцкіх выбарах не былі менш аб'яднанымі. Зараз без Аляксандра Мілінкевіча яны таксама не будуць менш аб'яднанымі.

С.Калінкіна: "Не вакол лідэра трэба аб'ядноўвацца, а вакол ідэі, тым больш што на сёньня няма адназначнага маральнага, палітычнага аўтарытэта ў дэмсілаў".

Кангрэс зафіксаваў, што апазыцыя ў нас розная, і калі яна і можа аб'яднацца, дык гэта толькі калі пытаньне стаіць рубам: барацьба за ўладу. А ўнутры апазыцыі вельмі і вельмі шмат розных супярэчнасьцяў. Мне здаецца, што не вакол лідэра трэба аб'ядноўвацца, а вакол ідэі, тым больш што на сёньняшні момант няма адназначнага маральнага, палітычнага аўтарытэта ў аб'яднаных дэмсілаў. І можа яно і лепей: калі будзе канкурэнцыя, то абодва бакі, можа, будуць больш мабільнымі, і гэты пэрыяд гэтага нічога ня робленьня нарэшце скончыцца, і ў гэтым сэнсе я гляджу ў будучыню аптымістычна".

Дракахруст: "Сп.Сіліцкі, а як бы вы падвялі агульны вынік гэтага Кангрэсу? Пра дэталі мы пагаворым потым".

Сіліцкі: "Што тут сказаць... Увесь год пасьля прэзыдэнцкіх выбараў ішла канкурэнцыя паміж лідэрамі паводле прынцыпу газонакасілкі: хто больш высоўваўся, таго і падрэзалі. А што тычыцца Кангрэсу дэмакратычных слабасьцяў, – даруйце, сілаў, – то відавочна, што ён склікаўся з адной мэтай: пераразьмеркаваць лідэрскія пазыцыі ўнутры апазыцыі. Проста для легітымізацыі гэтага Кангрэсу трэба было кіраўніцтву апазыцыі заявіць, куды рушыць, прадставіць штосьці незалежнаму грамадзтву, таму грамадзтву, якое выступае за дэмакратычныя перамены, але не заангажавана ў палітыку. Была прадстаўлена стратэгія чаканьня, я з гэтай ацэнкай згодны – а ведаеце, для таго, каб чакаць, не патрэбны ні Вячорка, ні Лябедзька, ні нават Мілінкевіч – тым больш не Калякін".

## БЕЛАРУСЬ ПРАБУРЫЦЬ У ІРАНЕ 14 СЬВІДРАВІНАЎ

**Іран цягам 14 дзён падрыхтуе для Беларусі "поле для дзейнасьці" ў паўднёвым нафтавым радовішчы Джафэйр. Пра гэта паведаміў інтэрнэт-сайт shana.ir іранскага Міністэрства нафтавай прамысловасьці.**

Адзначаецца, што праз два тыдні Іран наведае дэлегацыя беларускіх экспэртаў. Паводле аднаго з кіраўнікоў нацыянальнай нафтавай кампаніі NIOC сп.Насары, "колькасьць беларускіх інвэстыцыяў у праект пакуль няясная; вядома, што разьвіцьцё галіны зойме тры гады і што Беларусь прабурыць на радовішчы 14 сьвідравінаў, зь якіх штодня будуць дабываць 25 тысяч барэляў".

*Радыё Свабода*

## Пасьля заканчэньня Кангрэсу адбылася прэсавая канфэрэнцыя сустаршыняў Палітрады

**У Палітрадзе аб'яднаных дэмсілаў – 45 сябраў, абрана 4 сустрашыні: Вінцук Вячорка, Сяргей Калякін, Анатоль Лябедзька, Анатоль Ляўковіч. За гэта прагаласавал 35 чалавек, супраць выказалася 5.**

Пакуль невядома, хто з чатырох сустаршыняў будзе адказваць за які кірунак – невядома, у гэтым пытаньні, як сказаў на прэсавай канфэрэнцыі пасьля заканчэньня Кангрэсу спадар Калякін, усё будзе вызначаны ў сераду, калі адбудзецца чарговае паседжаньне Палітрады.

Анатоль Лябедзька сказаў нашаму радыё, што было спадзяваньне, што будзе 5 сустрашыняў, уключна Аляксандра Мілінкевіча, таму было вызначана 5 кірункаў дзейнасьці: першы – кіраўніцтва штабам па падрыхтоўцы да выбараў (у 2008 годлзе пройдуць выбары ў Палату прадлстаўнікоў); другі – нацыянальны выканаўчы камітэт, альбо ценевы ўрад, трэці – работа з рэгіёнамі, чацьвёрты – падрыхтоўка і правядзеньне палітычных акцыяў, і пяты – міжнародны кірунак.

На прэсавай канфэрэнцыі ўдзельнікі адказвалі на самыя розныя пытаньні. На пытаньне "навошта патрэбныя фракцыі?" сп.Калякін адказаў, што фракцыі патрэбныя дзеля таго, каб людзі былі напружаныя, каб яны, як ён сказаў, "не расслабляліся" і не сыходзілі з гэтых фракцыяў.

Таксама задавалася пытаньне, а што чатыры сустаршыні будуць рабіць у выпадку, калі галасы падзеляцца – два за, два супраць? На гэта быў адказ, што рашэньні будуць прымаць не сустаршыні, а прэзыдыум.

Было пытаньне пра Аляксандра Мілінкевіча: як успрыняць яго пазыцыю? С.Калякін сказаў, што гэта ягоны асабісты выбар, і нельга прымусіць чалавека рабіць тое, што ён ня хоча, але трэба аддаць павагу спадару Мілінкевічу, што ён не заклікаў сваіх прыхільнікаў байкатаваць працу кангрэса альбо Палітрады.

На пытаньне "куды ж павінна ісьці дэмакратычная Беларусь, на Захад альбо на Ўсход?" сп.Лябедзька сказаў, што гэта самае складанае пытаньне. 18 чэрвеня ў Маскве пройдзе круглы стол пра беларускарасейскія дачыненьні, дзе будзе шмат аналітыкаў і палітыкаў, і вось гэтае пытаньне будзе згадвацца і на гэтым круглым стале.

Таксама сп. Анатоль Ляўковіч, выканаўца абавязкаў старшыні БСДГ (Грамада) сказаў, што зараз, пасьля заканчэньня кангрэсу зьявіўся "чацьвёрты суб'ект": раней былі Ўсход, Захад, Лукашэнка, а цяпер зьявіўся чацьвёрты – аб'яднаныя дэмакратычныя сілы.

*Уладзімер Глод, Радыё Свабода*

# Савет рэспублікі ўхваліў законапраект аб скарачэньні ільготаў

**За гэта прагаласавалі ўсе 47 сябраў палаты, што былі ў залі. Нагадаем, што 23 траўня ніжняя палата Нацыянальнага сходу, Палата прадстаўнікоў, прыняла законапраект адразу ў двух чытаньнях. Ён прадугледжвае скарачэньне сацыяльных ільготаў прыкладна на чвэрць, што складае прыблізна 70 мільёнаў даляраў.**

Законапраект у Савеце рэспублікі прадстаўляў старшыня камісіі па гуманітарных пытаньнях Анатоль Новікаў. Ён падкрэсьліў, што ў выпадку ўхваленьня праекту ён уступіць у дзеяньне зь 1 студзеня 2008 году, а на працягу 3 месяцаў будзе падрыхтаваны ўказ прэзыдэнта аб адраснай сацыяльнай дапамозе.

Дэпутаты не задалі ані спадару Новікаву, ані міністру працы і сацыяльнага забесьпячэньня Ўладзіміру Патупчыку, які знаходзіўся ў залі, ніводнага пытаньня. Уся працэдура прадстаўленьня і ўхваленьня законапраекту заняла 4 хвіліны.

Цяпер ён стане законам, калі будзе падпісаны кіраўніком дзяржавы.

*Радыё Свабода*

# Вынікі Кангрэсу дэмакратычных сілаў: прычыны і наступствы

В.Сіліцкі: “Была прадстаўлена стратэгія чаканьня, – а каб чакаць, не патрэбны ні Вячорка, ні Лябедзька, ні Мілінкевіч – тым больш не Калякін”.

Дзьве стратэгіі дзеяньняў: адрозьненьні і падабенства

Дракахруст: “У пэўным сэнсе сэнсацыяй Кангрэсу стаў выступ МІколы Статкевіча, калі ён прапанаваў альтэрнатыўную стратэгію. Паводле яго, гэта стратэгія дзеяньня, а арганізатары кангрэсу прапанавалі, маўляў, стратэгію чаканьня. І ў першы дзень галасы амаль падзяліліся, а ў другі дзень стратэгія, папрапанаваная арганізатарамі кангрэсу, атрымала пераканаўчую перамогу. Чаму так адбылося і ў чым сапраўды прынцыповае адрозьненьне гэтых дзьвюх стратэгіяў?”

Калінкіна: “Я вам скажу свой пункт гледжаньня, бо я таксама ў першы дзень ня бачыла альтэрнатыўнай стратэгіі, якая прапанавалася, і я думаю, што наагул мала хто з дэлегатаў яе бачыў, чытаў, а толькі слухалі, што пра яе гаварылі. Потым, калі ўсе ўзялі раздрукоўку ўвечары і прачыталі, а сёньня ўжо галасавалі, то ўжо быў нейкі матэрыял для аналізу і для роздуму. Прынцыповых адрозьнеьняў няшмат, але галоўныя: адназначна пастаўленае пытаньне аб курсе Беларусі – уступленьне ў Эўразьвяз, і тое, што прапаноўвалася апазыцыйная вэртыкаль з адзіным лідэрам на чале.

С.Калінкіна: “Галоўныя адрозьненьні: адназначна пастаўленае пытаньне аб курсе Беларусі – уступленьне ў Эўразьвяз, і апазыцыйная вэртыкаль з адзіным лідэрам на чале”.

Што тычыцца актыўных дзеяньняў, вуліцы й г.д., то ў стратэгіі, прапанаванай кансалідаванай партыйнай большасьцю, прадугледжваецца ціск на ўлады: я так разумею, гэта і вулічны ціск, і маральны ціск, і празь нейкія акцыі, кампаніі і г.д. Таму тут якраз я ня бачу вялікай розьніцы. Ня трэба блытаць стратэгію і тактыку дзеяньняў – гэта розныя рэчы”.

Дракахруст: “Віталь Сіліцкі, вам слова для пярэчаньняў наконт таго, што сказала Сьвятлана наконт гэтых дзьвюх стратэгіяў, іх перавагаў і хібаў”.

Сіліцкі: “А не было стратэгіяў – былі дзьве тактыкі. Вось і ўсё. Адна тактыка: чаканьня, другая – я б сказаў, мала радыкальных дзеяньняў. І на кангрэсе кожны выбіраў, што па сабе, а кангрэс быў збольшага партыйны. Вуліца, вулічны супраціў – сёньня гэта справа незалежнага грамадзтва”.

В.Сіліцкі: “А не было стратэгіяў – былі дзьве тактыкі”.

Цыганкоў: “Я б сказаў, што адрозьненьняў даволі шмат. У сваім выступе Аляксандар Мілінкевіч, адказваючы на пытаньне пра адрозьненьні, зафіксаваў яшчэ некалькі пунктаў. Я згодны са Сьвятланай Калінкінай, якая адзначыла дзьве асноўныя рэчы: першае – вэртыкаль кіраваньня альбо сустаршынства, і другое – накірунак у Эўропу. У стратэгіі Статкевіча, якую падтрымлівае Мілікневіч, адзначаны тры рэчы: дэмакратыя, незалежнасьць і інтэграцыя з Эўропай. А кааліцыя, у якой прысутнічаюць камуністы, ніяк не магла зафіксаваць у сябе гэтую рэч, інтэграцыю з Эўропай.

В.Цыганкоў: “Кааліцыя, у якой прысутнічаюць камуністы, ніяк не магла зафіксаваць у сябе інтэграцыю з Эўропай”.

Мілінкевіч таксама адзначыў яшчэ некалькі пунктаў: ён ня згодны з высновамі, якія зроблены ў дакумэнце пад назвай “Кааліцыйная стратэгія”. Па-першае, ён ня так аптымістычна ацэньвае сёньняшнюю сытуацыю і лічыць, што ня будзе народнага абурэньня ў сувязі апошнім падвышэньнем цэнаў на газ. Па-другое, ён лічыць, што намэнклятура ня здольная на ўнутраны пераварот, яна застаршаная – у адрозьненьне ад таго, што пішуць у сваёй стратэгіі прадстаўнікі кааліцыі. І па-трэцяе, Мілінкевіч лічыць, што зараз улада не зьбіраецца ісьці ні на якія перамовы з апазыцыяй, паколькі мы, апазыцыя, слабыя, і ўлада на перамовы з намі ня пойдзе.

А сп. Статкевіч яшчэ больш ярка гэта выказаў: калі яму кажуць – эвалюцыя ўлады, то якая эвалюцыя? Калі раней быў адзін асуджаны маладафронтавец, Павал Севярынец, то зараз судзяць семярых маладафронтаўцаў – дзе эвалюцыя?”

Дракахруст: “А скажыце, калі ласка, у межах сваёй стратэгіі Мікола Статкевіч спадзяецца, што пераменаў у Беларусі можа дамагчыся толькі вуліца? Ці правільна я яго зразумеў?”

Цыганкоў: “Ён у межах сваёй стратэгіі больш надае ўвагі вуліцы і менш увагі – спробам ціску на ўладу: ціску дыпляматычнага праз замежных партнэраў або ціску на ўладу з боку структурнай апазыцыі. Ён таксама лічыць, што ўлада на гэты кампраміс ня пойдзе.

І калі ўжо закончыць з нашымі высновамі пра адрозьненьні – у залі адбываліся вельмі паказальныя сцэны, калі адзін з камуністаў гаварыў у сваім выступе пра “брацкі расейскі народ”, дык гэта відавочна не ўваходзіць у лексыку “Маладога фронту”. Цяжка ўявіць сабе, што сёньня зьбліжае “Малады фронт” і партыю камуністаў”.

Апошні дзень старшыні Палітычнай рады

Дракахруст: “А зараз – пра галоўную праблему, самую гучную, самую ў пэўным сэнсе скандальную – пра лідэрства. Па-першае, чаму гэтае пытаньне нават не было пастаўленае на галасаваньне, як гэта ўчора прапаноўваў Станіслаў Шушкевіч? Я прашу адказаць па сутнасьці, а не па працэдуры. І, па-другое, ці не адбудзецца ў цяперашняй сытуацыі вяртаньня апазыцыі ў той стан, у якім яна была да кастрычніка 2005 году, калі ў яе кіраўніцтве не было ня толькі лідэра, а нават першага сярод роўных?”

Калінкіна: “На самой справе пытаньне аб лідэрстве ставілася адназначна – якраз у той альтэрнатыўнай стратэгіі, якая прапаноўвалася. Гэтая стратэгія не прайшла. Я хачу вам нагадаць, што існавала джэнтэльмэнскае пагадненьне, дасягнутае ў Вільні, калі лідэры зусім зайшлі ў тупік і наогул не маглі вырашыць пытаньне аб лідэрстве. Тады быў прыняты кампрамісны варыянт: як прагаласуюць рэгіянальныя сходы, так і будзе ставіцца пытаньне на кангрэсе. Я сама была сьведкай, калі гэтае пагадненьне было заключанае. Усе лідэры, у тым ліку Аляксандар Мілінкевіч і Станіслаў Шушкевіч, далі джэнтэльмэнскае слова, што менавіта так яно й будзе, і што якімі б ні былі вынікі рэгіянальных сходаў, якімі б ні былі вынікі кангрэсу – яны іх прызнаюць і будуць працаваць разам з усімі.

С Калінкіна: “Таму і зафіксавана такое – ну, няма лідэра ў нас у апазыцыі, трэба, каб ён яшчэ рос”.

Ну, але адбылося так, як адбылося, ня ўсе сапраўды могуць быць джэнтэльмэнамі. Чаму так адбылося? Хочацца быць лідэрам, шмат каму хочацца, і гэта добра, калі партыйныя, палітычныя лідэры маюць такія амбіцыі. Але гэтыя амбіцыі сапраўды трэба заслужыць – заслужыць працай. А тое, што цябе нейкім там чынам прызначылі ці не прызначылі, ці ты сам неяк там прабіўся – гэта для нейкай асобы ці групы асобаў можа вырашыць асабістыя праблемы ці амбіцыі гэтай асобы або групы. Але для нас усіх, для краіны гэта сытуацыю прынцыпова не вырашае. Таму і зафіксавана такое – ну, няма лідэра ў нас у апазыцыі, трэба, каб ён яшчэ рос”.

Дракахруст: “Ну дык і што – сытуацыя вяртаецца, так бы мовіць, у верасень 2005 году?”

Калінкіна: “Ну, амаль што так. Цяпер у нас усе роўныя сярод роўных, а адзін – паасобку”.

Дракахруст: “Віталь Цыганкоў, вы, як і Сьвятлана, былі на кангрэсе – ці згодныя вы зь яе высновамі і з тым, як яна трактавала “подбіўку” галасаваньня і яе прагноз на будучыню што да кіраўніцтва апазыцыі?”

Цыганкоў: “Чаму не паставілі на галасаваньне прапанову Станіслава Шушкевіча? (Нагадаю, яна гучала вельмі канкрэтна – “давайце прагаласуем так: альбо ў нас будуць чатыры сустаршыні, або адзін старшыня – Аляксандар Мілінкевіч”.) Тут дзьве прычыны. Першая – празаічная: шмат каму не спадабалася, як закончыўся кангрэс, людзі чакалі нейкіх дэбатаў, але раптам пасьля прыняцьця стратэгіі ўсё скончылася, прагаласавалі за Палітраду. Галоўным аргумэнтам, як заўсёды, было, што “рэгіяналы сьпяшаюцца на цягнікі, калі мы іх затрымаем, яны не ад’едуць, давайце хутчэй галасаваць”. А другі аргумэнт палягае ў тым, што за канцэпцыю палітрады прагаласавала 365, супраць – 185 чалавек. Прыхільнікі Мілінкевіча ўжо й ня вельмі настойвалі на гэтым галасаваньні, бо разумелі, што яно ня пройдзе.

В.Цыганкоў: “Ад Мілінкевіча патрабавалі дзеяньняў тыя, хто якраз яго зьвязваў”.

Ну а што да таго – ці ёсьць лідэр... Я шмат чуў і на кангрэсе, і наагул за гэты год папрокаў на адрас Аляксандра Мілінкевіча, напэўна, значная частка зь іх слушная, але часта яны былі парадаксальныя. Ад Мілінкевіча патрабавалі дзеяньняў тыя, хто якраз яго зьвязваў, казаў, што ён “павінен дзейнічаць у рамках Палітычнай рады”, павінен зь ёй абгаворваць свае візыты, стварэньні сваіх рухаў. А як толькі ён пачынаў нешта рабіць, яны казалі яму, што гэта няправільна, ён робіць ня тое, што яму параіла Палітрада. Гэта як сёньня сказаў адзін з выступоўцаў – прадпрымальнік і палітвязень Васільеў, працытаваўшы словы з аднаго савецкага фільму – “добры чалавек, але не арол”. А ў мяне склалася ўражаньне – як толькі ён спрабуе станавіцца арлом, яго адразу ж, у тым ліку і на кангрэсе, абвінавачваюць у дыктатарстве... Дык вы вызначыцеся: альбо вы хочаце, каб ён нешта рабіў, альбо вам сапраўды трэба, каб ён нічога не рабіў”.

Дракахруст: “Віталь Сіліцкі, а як бы Вы адказалі на пытаньне – ці адбудзецца цяпер дэ факта вяртаньне да таго стану, які быў да мінулага кангрэсу, калі выразнага лідэра ў апазыцыі не было?”

Сіліцкі: “У кастрычніку 2005 году сп. Мілінкевіч перамог у першую чаргу за кошт грамадзянскай супольнасьці. Сёньня яе адціснулі. Тое, што адбылося ў сакавіку 2006 году – гэта таксама амаль выключна заслуга грамадзянскай супольнасьці. Палітычная апазыцыя з таго стану, у якім яна цяпер, ніколі і не выходзіла”.

Ці будзе раскол незваротным?

Дракахруст: “Кангрэс скончыўся. Што далей? Ці гэтыя словы ўсіх лідэраў – што яны будуць працягваць супольную працу, што нешта будзе рабіцца, – усё гэта толькі “добрая міна пры кепскай гульні”, а вось гэтая расколіна, якая была відавочная на кангрэсе – яна захаваецца і будзе паглыбляцца, і беларуская апазыцыя будзе ўяўляць сабою дзьве плыні, як сказаў сп. Мілінкевіч – левую і пранезалежніцкую? Ці яны сапраўды гавораць абсалютна шчыра і наладзяць дружную супольную працу?”

Сіліцкі: “Справа ў тым, што год таму была прынятая стратэгія – будзем пашыраць крызыс улады. Пашырылі толькі крызыс апазыцыі. Потым прынялі стратэгію дыялёгу. Не было нават абмеркаваньня, што штосьці прымалася і што пра штосьці дамаўляліся. Гэта ня толькі пайшло прахам, гэтага ніхто і рабіць не зьбіраўся.

В.Сіліцкі: “У наступным годзе будуць парлямэнцкія выбары і давядзецца ствараць нейкую новую “Пяцёрку +”... Зараз створаная сыстэма калектыўнай безадказнасьці”.

Вось мы тут нешта абмяркоўваем, спрачаемся, а хто праз год нават узгадае пра гэта? Я ня бачу прадмета для размовы. Магчыма, сапраўды, у наступным годзе будуць парлямэнцкія выбары і давядзецца ствараць нейкую новую “Пяцёрку +” ці нешта яшчэ і дамаўляцца аб супольнай працы. Але, на мой погляд зараз створаная сыстэма калектыўнай безадказнасьці, у якой і спытаць няма з каго. Палітычная апазыцыя жыве сама па сабе, незалежнае грамадзтва – само па сабе, інтэлектуалы – самі па сабе, у кангрэсовай квоце ў 21 чалавек. Народ жыве сам па сабе. Так і будзе.

Няма агульных мэтаў. Сядзець і чакаць дыялёгу – гэта не агульная мэта . Можна сядзець і чакаць у кааліцыі, можна сядзець і чакаць разьяднанымі – гэта адно і тое ж”.

Дракахруст: “Віталь, я працытаваў Аляксандра Мілінкевіча, які заявіў, што бачыць у апазыцыі два блёкі - левы і пранезалежніцкі. Гэтыя блёкі сапраўды паўсталі дэ факта ці не?”

Сіліцкі: “Не, я так ня думаю. Хаця прыхільнікі Мілінкевіча – людзі выразна незалежніцкія. Відавочная адсутнасьць ідэалягічных разыходжаньняў паміж Вячоркам і Мілінкевічам – але яны займаюць розныя бакі ў гэтым раскладзе. З другога боку, якая можа быць ідэалягічная еднасьць паміж Лябедзькам і Калякіным? Але яны разам.

В.Сіліцкі: “Я б не называў іх усіх агулам “левымі”. Ну якія Лябедзька, Вячорка ці Раманчук левыя? Якія яны прамаскоўскія?”

Тут пра ідэалёгію проста сьмешна казаць. Незалежнікаў у кааліцыйнай частцы таксама хапае, таму я б не называў іх усіх агулам “левымі”. Ну якія Лябедзька, Вячорка ці Раманчук левыя? Якія яны прамаскоўскія? Тут расклад абсалютна іншы. Так што я ў гэтым пытаньні зь Мілінкевічам нязгодны”.

Дракахруст: “Сьвятлана, а вы згодны зь Мілінкевічам, што расколіна атрымалася паводле ідэалягічных чыньнікаў? І больш шырокае пытаньне – як пасьля Кангрэсу пойдзе справа ў апазыцыі далей?”

Калінкіна: “Я зь Віталём Сіліцкім абсалютна згодная. Тая цытата зь Мілінкевіча, якую Вы зараз прачыталі – гэта мітынговая заява. Мне таксама здаецца, што яна не адпавядае рэчаіснасьці, і нельга зараз казаць, што менавіта на такім ідэалягічным падмурку: левыя ці правыя, прарасейскія ці праэўрапейскія, у апазыцыі адбыўся раскол. Мне здаецца, што галоўная прычына таго, што адбылося – не аб’ектыўная, а суб’ектыўная. Гэта была барацьба амбіцый, якая скончылася гэтак непрыемна для нас”.

Дракахруст: “Сьвятлана, ну і што далей?”

Калінкіна: “Я ўжо казала, што гляджу ў будучыню з аптымізмам. Калі будуць канкураваць два накірункі дэмакратычнага руху, гэта нават някепска. Магчыма, менавіта гэта будзе неяк паскараць нейкія працэсы і прымушаць быць актыўнымі. Да сёньняшняга дня ў апазыцыі быў адзіны лідэр. Але ад гэтага за больш чым год ніякай актыўнасьці не дадалося. Хто б што ні казаў, што хтосьці камусьці перашкаджаў, што былі нейкія правакацыі, але заўсёды адказвае той, хто браў на сябе адказнасьць.

С.Калінкіна: “Той давер, які быў дадзены Мілінкевічу, калі яго абралі адзіным, ён не апраўдаў”.

Аляксандар Мілінкевіч такую адказнасьць на сябе браў на мінулым Кангрэсе. Таму зараз мы вымушаныя прызнаць, што той аванс, той давер, які быў яму нададзены, калі яго абралі адзіным, ён не апраўдаў. Лідэр – гэта той, хто кансалідуе, а ня той, хто шукае паслухмяных выканаўцаў і не працуе з тымі, у каго іншыя падыходы. Трэба аб’ядноўваць, і менавіта такі лідэр патрэбны апазыцыі”.

Дракахруст: “Віталь Цыганкоў, я прашу і вас адказаць на два маіх пытаньні : ці азначае тое, што адбылося на Кангрэсе, незваротны раскол, і як далей будзе жыць апазыцыя, як будуць жыць дэмакратычныя сілы?”

Цыганкоў: “Лёгкія пытаньні... Але я спачатку наконт таго вызначэньня, якое даў спадар Мілінкевіч. Тут той выпадак, калі я згодны са сваімі суразмоўцамі і нязгодны зь Мілінкевічам. Калі ён казаў пра левы і незалежніцкі блёкі – гэта нармальная палітычная рыторыка, каб актывізаваць сваіх прыхільнікаў.

Што да таго, што гэта былі амбіцыі, мы, у прыватнасьці, Сьвятлана, ужо казалі, што амбіцыі ў палітыцы – гэта нармальная рэч, але ў патрэбныя моманты варта іх прыглушаць. Магчыма, сапраўды Мілінкевіч у нечым вінаваты, але, напрыклад, Аб’яднаная грамадзянская партыя, на думку многіх, няшмат дапамагала яму на прэзыдэнцкіх выбарах. І сваю частку адказнасьці яна правалíла, і Мілінкевіч вымушаны гэта памятаць, прычым гэта не сатрэш з памяці, калі ідуць размовы пра нейкае супрацоўніцтва.

Ну а наконт таго, што будзе, то гэты палітычны і духоўны раскол апазыцыі хаця і ня быў зацьверджаны на Кангрэсе афіцыйна, стаўся відавочным. І пытаньне ў тым, добра гэта ці дрэнна.

В.Цыганкоў: “Больш маладая частка апазыцыі, – за ідэі Мілінкевіча і Статкевіча галасавалі пераважна маладыя ўдзельнікі Кангрэсу, –будзе весьці больш актыўную і бескапрамісную барацьбу”.

